МАЕ ЗАКЛЯТЫЯ СУСЕДЗІ, альбо Што не дае жыць спакойна на лецішчы?

«Ну, як вам адпачываецца на дачы? З суседзямі, напэўна, сварыцеся?» — пытаюся ў знаёмай, якая на ўсё лета перабіраецца з горада бліжэй да прыроды.

«Не, у нас пакуль што ўсё добра і спакойна. У стылі «Санта-Барбары», — адказвае тая.

Але часам даводзіцца чуць пра суседскія адносіны, якія хутчэй нагадваюць не меладраму, а трылер. Гараджане, якія ў сваіх кватэрах літаральна «адчуваюць» суседзяў праз падлогу, сцены і столь, атрымаўшы большую асабістую прастору, пачынаюць за яе ваяваць. Скаргі дачнікаў бываюць розныя. Адны маюць пад сабой грунтоўную аснову, а іншыя проста атручваюць жыццё.

Тонкая сабачая душа

На гаспадароў гэтага лецішча пад Заслаўем ніколі ніякіх нараканняў не было. Кожны год яны прыязджалі сюды, лічы, на ўсе цёплыя месяцы, пакідаючы ў спакоі душны горад, і мірна адпачывалі, час ад часу наведваючы суседзяў і пераказваючы ім апошнія навіны пасёлка. «Спакойныя такія людзі, добрыя», — казалі пра іх. Усё змянілася сёлета, пасля таго, як гэтыя «добрыя людзі» пацвердзілі такое меркаванне пра сябе.

З вясны па пасёлку бадзяліся двое малых шчанюкоў. Невядома, адкуль яны там узяліся, ды гэта, зрэшты, і мала каго цікавіла. Відавочна было, што сабакі нічыйныя і вельмі галодныя. Аднойчы шчанюкі забеглі на тое самае лецішча, якое цяпер выклікае столькі хваляванняў. Гаспадары паглядзелі на худых жывёлін і пашкадавалі прагнаць. Тым больш што ў мінулым годзе нехта пару разоў пералазіў праз лёгкія драўляныя веснічкі і нахабна таптаўся па градах з клубнікамі. А летам, калі свежае паветра вакол, сон бывае надзвычай моцны. Таму сабакі засталіся на ўчастку ў якасці вартаўнікоў. Цяпер яны падраслі і ўжо сядзяць на ланцугах, калі ж праходзіць нехта міма — сумленна гаўкаюць. Бакі ў сабак заўважна пакруглелі, а поўсць стала блішчэць. Здавалася б, гаспадары цяпер могуць моцна спаць і не хвалявацца за свой ураджай. Суседзі ж лічаць, што гэта наўрад ці. Тут ужо ўзнікае пытанне, як наогул магчыма заснуць? Справа ў тым, што калі настае ноч, сабакі брахаць не перастаюць, а робяць гэта ледзь не з двайным старанненм.

Яны ж яшчэ часам і выюць. Вока самкнуць немагчыма, наракаюць суседзі.

А гаспадары тым часам спакойна працягваюць гадаваць сваіх гадаванцаў, матывуючы іх неўраўнаважаны характар тым, што сабакі былі бяздомнымі і яшчэ не зусім забыліся на мінулае цяжкае жыццё. Таму і такія нервовыя. Пройдзе час — супакояцца. Суседзі за галаву бяруцца і думаюць хто пра атруту ў кавалку каўбасы, хто пра скаргу ў патрэбныя інстанцыі.

Жыццё ў чужым цені

У адным пасёлку з нервовымі сабачкамі жыве чалавек, сэнс існавання якому атручвае суседскі двухметровы плот. Але тут патрэбная перадгісторыя.

Спачатку гаспадар злашчаснага плота збудаваў на сваім участку дом. Вялікі, двухпавярховы, з чырвонай цэглы. Заказаў вокны з натуральнага дрэва, зрабіў веранду. Карацей кажучы, ёсць на што паглядзець. Толькі цікаўных гэты чалавек, відаць, не надта любіў, таму і заняўся пабудовай плота. Той, хто цяпер церпіць прысутнасць на сваім двары вялізнага ценю ад яго, спачатку проста назіраў, як цаглінка за цаглінкай расце плот у вышыню і, па-першае, поўнасцю закрывае агляд з аднаго боку, а па-другое — крадзе магчымасць што-небудзь пасадзіць на даволі значнай частцы зямельнага надзелу. Без сонца, у цені, ніякая агародніна не прыжываецца.

Вайна ішла яшчэ тая. Скардзіліся куды толькі можна — старшыні садовага таварыства, у райвыканкам, але плот так і не знік. «Ды і як яго зрушыш цяпер, хіба што толькі ўзарваць», — жартуюць жыхары пасёлка.

А гаспадар участка, на якім ляжыць цень, хвалюецца за бескарысныя цяпер для агародніцтва метры, але з суседам не канфліктуе. З-за двухметровага плота таго цяжкавата выцягнуць на размову.

Абрыкосы — не альпійскія дрэвы

— Мае дзеці вельмі любяць абрыкосавае варэнне. Хоць і дарослыя ўжо, а ўсё роўна, калі сезон, прыязджаюць пакаштаваць, расказвае жыхарка Брэста Ніна Анатольеўна.

Ніна Анатольеўна мае ўчастак за горадам, дзе пабудаваны невялікі драўляны дамок, пасаджана шмат агародніны і кветак і куды любяць наведвацца ў госці шматлікія родзічы.

Два гады таму суседні ўчастак памяняў гаспадароў. Маладая пара, якая яго набыла, і чуць не хацела пра розныя гуркі-памідоры на сваім лецішчы. Толькі газон, альтанка і прыгожы дом. Працяжнікі раслінаў разнастайнасці аказаліся супраць нават суседскіх абрыкосаў. Самае вялікае дрэва расце якраз побач з іх участкам.

Гэтая дзяўчына захацела сабе альпійскую горку. Прыехалі нейкія спецыялісты, зрабілі. Якраз пад маім плотам, скардзіцца Ніна Анатольеўна.

Адносіны ва ўладальнікаў альпійскай горкі і абрыкосавага дрэва абвастраюцца тады, калі апошняе пладаносіць. Дрэва старое, разгалістае, таму спелыя абрыкосы падаюць не толькі на свой двор, але і на суседскі. І калі гаспадыня ведае працьму рэцэптаў, як іх зварыць-закатаць-з'есці, то маладым суседзям тыя абрыкосы ні ў якім выглядзе не патрэбныя:

— Мінулыя суседзі ў мяне іх вёдрамі бралі. Ягад жа шмат, усе не з'ядаем. А гэтыя кажуць, што паданкі гніюць, патрабуюць, каб мы што-небудзь з дрэвам зрабілі. А што зробіш? Калі спілоўваць тую вялікую галіну, што да іх у двор расце, можна і ўсё дрэва адразу зразаць. Што ўжо там ад яго застанецца?

Суседзі матывуюць свае патрабаванні тым, што гнілыя ягады разводзяць на альпійскай горцы сырасць і грязь, перашкаджаюць расці адмысловым дарагім кветкам. Тыя хварэюць і прападаюць. Да абвінавачванняў у стварэнні неналежнага санітарнага стану на суседскай клумбе Ніна Анатольеўна ставіцца спакойна:

— Галоўнае, каб якім бензінам уночы не падлілі мой абрыкос. А то хто іх ведае...

Гэта вам не пляж!.. І нават не салярый!

Марына зараз вучыцца ў Мінску. Дом бацькоў, куды прыязджае на выхадныя і канікулы, знаходзіцца ля Гродна. Прычым горад зусім недалёка, многія гродзенцы ў гэтым пасёлку маюць дачы. Побач з домам пасаджаны сад, дзе можна прыемна бавіць час летам.

Аднойчы бацька Марыны атрымаў надзвычай дзіўную скаргу ад суседа:

«Што ваша дачка сабе дазваляе? Як мне цяпер хадзіць па двары, калі побач жыве такая бессаромніца?» — злаваўся ён.

Бацька спачатку не зразумеў, чаго гэта яго дзіця так абражаюць, і хацеў нават даць кухталя панікёру. Але ўсё ж вырашыў спачатку спытацца, у чым жа тут справа.

Аказалася, што сусед патрабуе, каб Марына хадзіла загараць у сад толькі ў «прыстойным выглядзе». То бок, каб не забывалася апранаць верхнюю частку купальніка. Да таго ж сусед яшчэ колькі хвілін з надрывам распавядаў, як яго хвалююць густы і выхаванне сучаснай моладзі і даводзіў, што загараць вось так дзяўчатам ледзь не смяротна небяспечна.

Бацька толькі пасмяяўся. Каб убачыць, што нехта загарае ў нашым садзе, патрэбна вельмі пастарацца. Дрэвы даволі старыя, трэба проста неймаверна прыглядацца.

Сусед паабяцаў паскардзіцца «куды трэба», калі такое яшчэ паўторыцца, а Марына сумуе, што прыйдзецца хадзіць паласатай. Дзяўчаты яе зразумеюць. А сусед?

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Алег РУМО:

Высокія тэхналогіі ў медыцыне

«КОЖНЫ З НАС МОЖА БЫЦЬ ДОНАРАМ АБО РЭЦЫПІЕНТАМ»

СЁЛЕТА ў Беларусі плануецца правесці каля 300 перасадак органаў. За паўгода зроблена ўжо 151 трансплантацыя. Па колькасці на 1 мільён насельніцтва гэта больш, чым у Польшчы ці Грэцыі і супастаўляльна з тым, што ёсць у Ізраілі. Трансплантацыя органаў і тканак — самы высокатэхналагічны від медыцынскай дапамогі. Ён не здольны палепшыць дэмаграфічныя паказчыкі або ўратаваць чалавецтва ад невылечных хвароб. Аднак гэта ёсць сведчанне высокага ўзроўню медыцыны ў краіне, «лакаматыў», які падцягвае за сабой анкалогію, кардыялогію і шэраг іншых медыцынскіх спецыялізацый.

Трэба разумець, што лісты чакання на перасадку той жа ныркі, сэрца ці печані — нармальная практыка ва ўсім свеце. Такая практыка ёсць і ў нас, і, што характэрна, дачакацца перасадкі той жа ныркі (самы распаўсюджаны від трансплантацыі) пацыент можа літаральна на працягу 2 гадоў (гэта адпавядае міжнародным стандартам). Праўда, у ЗША, напрыклад, ліст чакання — агульны для «сваіх» і замежных грамадзян, а ў краінах Еўрасаюза, у тым ліку і ў нашай, для замежнікаў прадугледжана квота: колькасць трансплантацый органаў апошнім не павінна перавышаць прыкладна 10 працэнтаў. Дарэчы, колькасць такіх трансплантацый нельга пастаянна «нарошчваць»: выкананнем выключна самой аперацыі справа не заканчваецца. Далей пацыентам патрабуецца пастаянны прыём вялікай колькасці дарагіх лекаў, якія не вырабляюцца ў нашай краіне. Іх агульнагадавы кошт — ад 5 тыс. долараў, і ўсе гэтыя затраты бярэ на сябе дзяржава.

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача па хірургіі 9-й гарадской клінічнай бальніцы, кіраўніка РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак, галоўнага пазаштатнага трансплантолага Міністэрства аховы здароўя Беларусі Алега РУМО**, выкананне аперацый нашым грамадзянам застаецца прыярытэтным. Груба кажучы, калі адзін орган «падыходзіць» і беларусу, і замежніку, то перасадка будзе зроблена суайчынніку, хоць, як правіла, размова ідзе аб тым, каб каштоўны орган падышоў хоць бы некаму. Наогул летась было выканана 169 перасадак органаў, з іх толькі 8 — замежным грамадзянам. Сёлета гэта 14 са 151. Рэнтабельнасць аперацый, якія выконваюцца замежнікам, вельмі высокая. За адну такую аперацыю можна выканаць 2-3 аперацыі нашым грамадзянам.

Трансплантацыя — не проста апошні метад лячэння, але і метад самы дарагі, да таго ж звязаны з велізарнай колькасцю ўскладненняў. Трансплантолагі кажуць, што па гэтай прычыне яны куды лепш за інфекцыяністаў разбіраюцца ў інфекцыйнай паталогіі. Для таго, каб новы орган прыжыўся, пацыенту прызначаецца спецыяльная тэрапія, якая пастаянна падаўляе імунітэт. А на гэтым фоне развіццё любой, нават самай нязначнай (для звычайнага чалавека) інфекцыі працякае непрадказальна. Вось, у прынцыпе, і адказ на пытанне, чаму трансплантацыйныя тэхналогіі такія дарагія. Таму што вельмі дорага каштуе каласальная колькасць прэпаратаў, якія неабходна прымяняць для таго, каб перасадка аказалася паспяховай. Сам жа орган (перасаджваюцца пераважна органы трупных донараў) нічога не каштуе...

«Для нас донар — гэта жывы чалавек, — расказвае **дырэктар РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, галоўны пазаштатны дзіцячы анкагематолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Вольга АЛЕЙНІКАВА.** — Для перасадкі коснага мозга неабходна ўзяць косны мозг, ствалавую клетку ў жывога донара. Дарэчы, вось ужо гадоў дзесяць як мы выконваем самую вялікую сярод краін былога Саюза колькасць аперацый па перасадцы коснага мозга. Праўда, толькі цяпер мы пачалі фарміраваць гарадскі рэгістр донараў. Ёсць надзея, што паступова створым і рэспубліканскі, а сумесна з Расіяй — і славянскі рэгістр донараў коснага мозга».

Узровень актыўнасці выканання перасадак сэрца ў нас сёння вышэй, чым, скажам, у Расіі. На гэтым тыдні нашы трансплантолагі правялі 50-ю перасадку сэрца. У бліжэйшы час будуць ажыццёўлены комплексныя аперацыі па перасадцы сэрца і ныркі, затым сэрца і лёгкага, пасля сэрца і печані, кажа **загадчык лабараторыі хірургіі сэрца РНПЦ «Кардыялогія», галоўны пазаштатны кардыяхірург Міністэрства аховы здароўя Беларусі Юрый АСТРОЎСКІ.** Ён таксама паведаміў, што ў наступныя некалькі месяцаў беларуская брыгада спецыялістаў будзе працаваць разам з казахскімі спецыялістамі, каб яшчэ да канца гэтага года ў Казахстане была праведзена першая перасадка сэрца.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Эпіднагляд

АСЦЯРОЖНА: У ВАДЗЕ ЦЫРКАРЫІ

ЯК правіла, летам да некалькі соцень чалавек звяртаюцца ў медыцынскія ўстановы са скаргамі на чырвоныя пухіры, якія з'явіліся пасля купання ў вадаёме і свярбяць. Так праяўляе сябе паразітарнае захворванне цыркарыёз. Хвароба выклікаецца лічынкамі некаторых відаў глістоў (цыркарый) вадаплаўных птушак. Крыніцай іх могуць быць і малюскі.

Праявы цыркарыёзу наступаюць на працягу першай паўгадзіны. Там, куды трапілі цыркарыі, скура чырванее, адчуваецца паколванне, сверб. Праз некалькі гадзін з'яўляецца высыпка, пухіры памерам з гарошыну, можа таксама ўзнікнуць слабасць, галавакружэнне, парушэнне сну, павышаецца тэмпература, часам бывае сухі кашаль. Праз 7—10 сутак клінічныя праявы аслабнуць, а пігментацыя на месцы высыпкі і лёгкі сверб застаюцца яшчэ 2—3 тыдні. Абвастрэнні ці ўскладненні могуць наступіць у сувязі з паўторнымі заражэннямі. Пры наяўнасці лёгачнага сіндрому захворванне працякае больш цяжка і патрабуе ўрачэбнага ўмяшання.

Зона павышанай рызыкі — стаячыя вадаёмы, забруджаныя арганічнымі і бытавымі адходамі, з вялікай воднай расліннасцю, дзе водзяцца рачныя смаўжы і на паверхні якіх плаваюць птушкі.

Неспрыяльным па гэтым захворванні з'яўляецца возера Нарач. Некалькі гадоў таму была прынята дзяржаўная праграма па экалагічным аздараўленні гэтага вадаёма. Дзякуючы яе выкананню і комплекснай барацьбе з цыркарыёзам на Нарачы колькасць пацярпелых ад алергіі пасля купання скарацілася ў разы.

Аднак, як адзначае **загадчыца аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ЖЭЎНЯК**, гаварыць пра тое, што цыркарыёзу на Нарачы і ў іншых вадаёмах рэспублікі ўвогуле няма, нельга. Справа ў тым, што ад кожнага заражанага малюска на працягу яго жыцця на свет з'яўляюцца тысячы лічынак. А гэта вялікая верагоднасць таго, што купальшчык зможа сустрэцца ў вадзе з новымі носьбітамі цыркарый. Таму не варта грэбаваць пэўнымі мерамі перасцярогі.

- Пры купанні, мыцці бялізны, гульнях у вадзе, рыбнай лоўлі трэба пазбягаць зарослых, мелкаводных участкаў.
- Купацца трэба толькі на спецыяльна абсталяваных пляжах, рыбу лавіць больш бяспечна з берага, лодкі, моста.
- Не варта рабіць заплывы ў месцах, дзе водзяцца рачныя смаўжы, і там, дзе адпачывальнікі падкормліваюць вадаплаўных птушак.
- У вадзе трэба знаходзіцца не больш чым 5—10 хвілін.
- Пасля купання ў падазроным вадаёме неабходна старанна выцерці скуру ручніком і хутка змяніць адзенне, якое прамокла.
- Калі вы пахадзілі басанож па мелкаводдзі ці па мокрай траве ля рэчкі, варта інтэнсіўна выціраць ногі праз кожныя 2—3 хвіліны: цыркарыі пранікаюць у эпідэрміс на працягу 3—4 хвілін, і іх можна паспрабаваць выдаліць механічна.
- Пры неабходнасці працяглага знаходжання ў вадзе (напрыклад, працы ў сажалкавых гаспадарках і інш.) абавязкова прымяняць ахоўнае адзенне і абутак.
- Варта выкарыстоўваць рэпеленты (дыметылфталат, дыэтылталуамід і інш.) або прыгатаваныя на іх аснове крэмы і мазі. Гэтыя сродкі, нанесеныя на скуру, прыкладна на працягу 1,5—2 гадзін засцерагаюць ад лічынак цыркарый.

Тым жа, каму не ўдалося пазбегнуць цыркарыёзнага дэрматыту, пазбавіцца ад свербу дапамогуць ментолавыя і дымедролавыя мазі, в'етнамскі бальзам, прамыванне содавым растворам. У цяжкіх выпадках трэба абавязкова звярнуцца да ўрача.

Вольга ШАЎКО.

Натура

НЕ МОЖАМ АЛЬБО НЕ ХОЧАМ?

Беларускі рынак аўтамабільных «дробязяў» практычна цалкам запоўнены замежнай прадукцыяй. А нам «слабо»?

Як, паводле нармальнай эканамічнай логікі, павінны дзейнічаць вытворцы, зацікаўленыя ў канкурэнтнай барацьбе, у прасоўванні сваіх тавараў на рынках, у задавальненні інтарэсаў спажыўцоў і ва ўласных таварных аб'ёмах, прыбытках, заробках? Зразумела, імкнуцца аператыўна адсочваць сітуацыю па той ці іншай прадукцыі і, убачыўшы тую ці іншую «нішу», дзе рэальна прысутнічаць самім, як мага хутчэй наладзіць выраб канкурэнтных па цане і якасці вырабаў. Асабліва калі гэта тычыцца не замежжа, а ўласнай краіны, нават горада, дзе гэтае прадпрыемства знаходзіцца. Няўжо не хвалюе, не крыўдна, калі на нашым унутраным рынку ўладараць са сваім таварам іншаземцы?

МЕНАВІТА так, як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», сёння і адбываецца на рынку так званых аўтамабільных «дробязяў». Хоць пытанне выраву аксесуараў, рэчаў, што патрэбныя літаральна кожнаму аўтаўладальніку, зусім не дробязнае — і для кожнага кіроўцы, і, без перабольшання, для вялізнай па аб'ёмах вытворчай галіны. Мяркуйце самі: толькі ў Прынямонні, паводле звестак Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі, колькасць машын павялічылася з 311,7 тысячы ў 2001 годзе да 469 тысяч — у мінулым. А кожным «колам», зразумела, не абысціся без належнага догляду — і гэта не толькі маторнае масла ці фільтры, але і мноства іншых сродкаў, а таксама інструментаў і прыстасаванняў. Хто аспрэчыць, што гэта — проста каласальныя аб'ёмы гандлёвага абароту і, адпаведна, вялізныя грошы з кашалькоў дзясяткаў і соцень тысяч аўтаўладальнікаў?

Што ж, паглядзім, наколькі канкурэнтна выглядае айчынная вытворчасць на рынку не даўно вядомых не толькі ў нашай краіне грузавікоў, але і ў «нішы», так бы мовіць, вырабаў шырокага народнага спажывання — «дробязяў» для «легкавікоў».

Спачатку накіроўваюся на адну з аўтазаправачных станцый «Беларуснафты» ў Гродне. Тут, як відаць, неабыякавыя да азнаямлення кліентаў з прадукцыяй прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім». На спецыяльных стэндах ля ўваходу ў памяшканне АЗС дэманструюцца нафтанаўскае маторнае масла, лідскі тасол, кіслотны электраліт, графітная змазка, масціка ахоўная для днішча машыны, аўтакансервант парогаў «Мавіль», бензін-растваральнік, мадыфікатар іржы, шклоамывальная і тармазная вадкасці, трымальнік нумара аўтамабіля, шчотка, трос...

ДОБРА, вядома. Аднак ці дастаткова гэтага цяпер — не для «Жыгулёў» ці «Масквічоў», як за савецкім часам, а ў сённяшніх умовах ледзь не ўсеагульнай аўтамабілізацыі насельніцтва? Наколькі ўлічваюцца айчыннай прамысловасцю сучасныя «фішкі» ў доглядзе машын?

Знаёмлюся з вырабамі на паліцах магазіна гэтай АЗС. Чаго тут толькі няма, каб задаволіць «капрызы» аўтааматараў ... Вось, напрыклад, паліроль для пластыка з асвяжальнікам паветра: паводле інфармацыі на этыкетцы, гэты сродак зроблены ў Вялікабрытаніі, адтуль ён трапіў ва Украіну, а затым да нас. Другім імпарцёрам (а гэта ж, відавочна, і адпаведная цэнавая «накрутка») з'яўляецца і гродзенская фірма, якая атрымала з Калінінграда «транзітам» з Літвы ачышчальнік панэлі аўтамабіляў. Эластычны герметык, аказваецца, вырабляны ў Славеніі, ачышчальнік інжэктара хуткага дзеяння і вадкі герметык радыятара — у ЗША, размарожвальнік шкла і ачышчальнік карбюратара — у Расіі, салфеткі для ачысткі пластыкавых элементаў аўтамабіля, шкла і люстэркаў, канцэнтрат для мыцця аўтамабіляў, каляровая паліроль — у Германіі, ачышчальнік і кандыцыянер скуранога пакрыцця — у Вялікабрытаніі (500 мл — 76 тысяч 750 рублёў), аўташампунь — у Літве і Польшчы... Пералік імпарту можна працягваць. Ёсць, праўда, тут і беларускі сродак — для ачысткі аўтамабільнага шкла, але гэта як кропля ў моры замежных тавараў...

НАСУПРАЦЬ — АЗС «Газпрамнафта». На ўваходзе кліенту прапануюцца ўкраінскія акумулятары, а ў памяшканні ў вочы кідаецца таксама пераважна імпарт. Маторнае масла — расійскае, польскае і літоўскае, розныя ачышчальнікі і змазкі — з тых жа краін, а таксама з Германіі, аўтамабільныя лямпы напальвання — літоўскія і венгерскія, састаў для рамонту радыятараў і сістэмы ахалоджвання — амерыканскі, акрылавая аэразольная фарба — з Тайланду... А такі «звышскладаны» для вытворцаў аксесуар, як трымальнік для тэлефона ў транспартным сродку (коштам 99 тысяч 980 рублёў), выраблены ў Галандыі. Можна таксама набыць трымальнік для напояў — кітайцы паклапаціліся. Беларуская ж вытворчасць прадстаўлена хіба што тасолам і тармазной вадкасцю, ды і тое ў канкурэнцыі з замежнымі вытворцамі. Гэта добра, што ў пакупніка ёсць выбар. Аднак хіба ж нармальна, што па многіх вышэйзгаданых і іншых пазіцыях няма нічога беларускага...

Мо ўсё інакш на рэчавым рынку «Паўднёвы», дзе найбольшы ў Гродне выбар запчастак і аксесуараў для аўтамабіляў? Мажліва, не ўсё ўбачыў, але з айчынных вырабаў там прадстаўлены хіба што бабруйскія шыны для легкавікоў і гродзенскі 647-ы растваральнік. Паводле слоў аднаго з гандляроў, індывідуальнага прадпрымальніка Дзмітрыя, усё на рынку пасля дэвальвацыі беларускага рубля падаражэла практычна ўдвая. І айчынны растваральнік, дарэчы, таксама: быў па 6-7 тысяч, а цяпер — па 15 тысяч рублёў. А з іншымі беларускімі таварамі Дзмітрый справы не мае, бо ніхто іх не прапануе. Хіба што ў аднаго ІП браў пераўтваральнік іржы, але потым рэзка ўзрасла цана. Цяпер гандлюе расійскім ...

АСАРТЫМЕНТ тавараў у Дзмітрыя, як і ў іншых гандляроў у «Паўднёвым», даволі разнастайны. Пра гэта клапоцяцца замест нас саміх палякі, літоўцы, немцы, кітайцы, італьянцы, расіяне, англічане. У асноўным тавар трапляе ў Гродна праз Польшчу, прычым неабавязкова ад тамтэйшых вытворцаў, а ад пасярэднікаў, якія імпартуюць з іншых краін. На думку Дзмітрыя, ёсць такія рэчы, за якія нам, можа, брацца і не варта. Але шмат і таго, што пры жаданні зусім не складана вырабляць самім.

Калега Дзмітрыя па працы ў «Паўднёвым» Іван Іванавіч кажа, што калісьці гандляваў айчыннымі дамкратамі, але адмовіўся, бо яны «якімі выраблялiся 30 гадоў таму — такімі і вырабляюцца, а свет ідзе далей».

РАДЫ быў бы гандляваць беларускім, ды не атрымліваецца і ў індывідуальнага прадпрымальніка Савы. Яго профіль — шырокі асартымент ключоў, адвёртак, здымнікаў і іншых інструментаў, дзясяткі відаў крапяжу — балтоў, гаек ... Тое-сёе на беларускіх прадпрыемствах вырабляецца, аднак, лічыць Сава, можна выпускаць у 50 разоў больш, бо патрабуюцца, як правіла, не высокія тэхналогіі, а элементарныя станкі. У каго яны не задзейнічаны на поўную моц — прыедзьце ў «Паўднёвы» да Савы і пацікаўцеся, якую можна скласці канкурэнцыю імпарту. У прыватнасці, ніхто ў Беларусі не вырабляе інструментарый для іншамарак. А галоўнае, няма жадання бачыць у тым жа Саве партнёра па бізнэсе.

— Прыязджаю ў адну маскоўскую фірму, якая займаецца інструментамі — там усё ёсць. А ў нас? Няўжо я павінен ездзіць па ўсіх прадпрыемствах за тымі ці іншымі вырабамі? Дзе ў Беларусі аптовыя пункты, дзе я мог бы набыць шырокі асартымент беларускіх тавараў патрэбнага профілю? Ды і купляць дробнымі партыямі бывае праблематычна. Бяры, кажуць нядаўна на адным з прадпрыемстваў, 25-кілаграмовую ўпакоўку. Але навошта мне столькі? Хіба што для ўнукаў пакінуць, каб гандлявалі ...

Дык што, не можам на ўласным жа рынку скласці годную канкурэнцыю замежнай прадукцыі? Альбо не хочам? Адназначнага адказу, пэўна, не будзе. І тут можна доўга разважаць пра неўспрымальнасць буйной прамысловасці да запытаў спажывецкага рынку, развіццё ў рэспубліцы прадпрыемстваў малога і сярэдняга вытворчага бізнэсу, з адпаведнымі прэферэнцыямі, якія б зрабілі выгадным, стымулявалі выпуск тых жа аўтамабільных «дробязяў». Аднак пакуль мы разважаем, замежны бізнэс ужо даўно вывучыў патрэбы аўтааматараў, у тым ліку беларускіх, і эфектыўна працуе.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, ХАПІ ПАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Богнай. Звездзень. Кляўза. Конас. Банту. Меч. Конка. Амур. Найрэйс. Тек. Асада. Арбіт. Кран. Рак. Гонка. Пашана. Гул. Ніт. Лемур. Ланік. Сом. Кава. Банкетка. Адрэза. Смага. Лёк. «Трое». Чака. Лангуст. Рупь. Кірок. Тран. Рад. Тора. Абоз. Цасцяр. Макавей.

Па вертыкалі: Фугінак. Піла. Банка. Праяік. Нарэ. Аніка. Дзяка. Скат. Кукша. Амагар. Звяно. Боб. Лунка. Ром. Нізка. Маматок.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3391. Нумар падпісаны ў 19.30 15 ліпеня 2011 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12